Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ВЫВУЧЭННЕ РОДНАГА КРАЮ ЯК СРОДАК ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ

*Матэрыялы студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі*

*г.Мінск, 5 красавіка 2005 г.*

Мінск 2005

**УДК 37.035.6**
**ББК 74.200.50**
**В921**

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Рэдакцыйная калегія:*
кандыдат гістарычных навук, ст. выкладчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання БДПУ гісторыі *А. І. Багдановіч;*
кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ *І. І. Багдановіч* (навук. рэд.);
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *А. У. Малюгін;*
аспірантка кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *У. Л. Калечыц*

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *У. В. Тугай;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А. А. Цобкала*

В921 **Вывучэнне** роднага краю як сродак патрыятычнага выхавання моладзі : матэрыялы студ. навук.-практ. канф., г. Мінск, 5 крас. 2005 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал.: А. І. Багдановіч [і інш.]; І. І. Багдановіч (навук. рэд). — Мн. : БДПУ, 2005. — 96 с.
ISBN 985-501-017-5.

У зборніку змешчаны малавядомыя звесткі з рэгіянальнай гісторыі Бацькаўшчыны. Актуалізуюцца праблемы сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі. Разглядаюцца пытанні этналогіі, археалогіі і краязнаўства. Вызначаюцца шляхі патрыятычнага выхавання моладзі.

Адрасуецца студэнтам, выкладчыкам, аспірантам і настаўнікам, усім, хто цікавіцца гістарычнай навукай.

**УДК 37.035.6**
**ББК 74.200.50**

**ISBN 985-501-017-5**

© ВВЦ БДПУ, 2005



## ПРАДМОВА

Гістарычнае краязнаўства – гэта шлях да пазнання сваіх каранёў – гісторыі сваёй "малой" радзімы. З яго пачынаецца навуковы пошук, адкрыццё новага, малавядомага не толькі для самаго сябе, але, часам, і для фундаментальнай гістарычнай навукі. Беларуская зямля мае багатую гісторыю, якая прайшла праз жыццё і лёсы кожнага яе жыхара ў самых аддаленых яе куточках. Паўсядзённая гісторыя народа – гэта адзін з найважнейшых напрамкаў краязнаўчых даследаванняў, якія вядуцца ў нашай краіне з даўніх часоў.

Многія студэнты гістарычнага факультэта пачалі цікавіцца гісторыяй роднага краю яшчэ ў школе, займаючыся ў гісторыка-краязнаўчых гуртках і ўдзельнічаючы ў рабоце школьных гісторыка-краязнаўчых музеяў. Вывучаючы гістарычнае краязнаўства ва універсітэце, яны пазнаёміліся з асаблівасцямі навуковага краязнаўчага даследавання, яго асноўнымі крыніцамі і метадамі. Кожны студэнт у працэсе вывучэння гістарычнага краязнаўства напісаў рэферат аб помніках археалогіі, гісторыі ці культуры роднага краю, знакамітых земляках, гістарычных падзеях, якія адбываліся на іх малой радзіме. Лепшыя з гэтых рэфератаў сталі асновай для навуковых дакладаў і выступленняў, падрыхтаваных да стаўшай традыцыйнай на гістарычным факультэце студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі "Вывучэнне роднага краю – сродак патрыятычнага выхавання моладзі". Для часткі студэнтаў гэта навуковы дэбют, які зрабіўся магчымым дзякуючы навуковым кіраўнікам, выкладчыкам гістарычнага факультэта, якія аказалі значную дапамогу сваім выхаванцам у афармленні і рэдагаванні навуковых дакладаў.

Безумоўна, навуковы ўзровень змешчаных у зборніку артыкулаў розны. Для некаторых аўтараў гэта першая спроба пяра, для большасці – прадаўжэнне даследавання ў галіне ўжо выразна вызначанага ўстойлівага інтарэсу да тых або іншых навуковых праблем, актуальных не толькі для саміх удзельнікаў канферэнцыі, але і для айчыннай гістарыяграфіі.

Публікацыя вынікаў студэнцкіх навуковых даследаванняў, бясспрэчна, з'яўляецца важным стымулам далейшай навуковай работы і можа стаць першым крокам на шляху станаўлення прафесійнага гісторыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**БОСНИЙСКИЙ КРИЗИС И РОЛЬ НАТО В ЕГО УРЕГУЛИРОВАНИИ** (Близнец И.) .......... 65

**ИЗМЕНЕНИЯ В ДУХОВНОЙ ЖИЗНИ ЯПОНСКОГО ОБЩЕСТВА ПОСЛЕ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ** (Вильтовская В.) .......... 68

**«СОЦИАЛЬНОЕ ХРИСТИАНСТВО» КАК ОСНОВА ИДЕОЛОГИИ АВСТРОФАШИЗМА** (Казаченок Т.В.) .......... 71

**ИСТОРИЯ ВОЗНИКНОВЕНИЯ БАХАИЗМА** (Климович А.) .......... 74

**ОСОБЕННОСТИ ПРОРОЧЕСКОГО ДВИЖЕНИЯ В ПАЛЕСТИНЕ** (Лозко Е.) .......... 77

**СТОЛИЧНЫЕ ГОРОДА НОВОАССИРИЙСКОЙ ДЕРЖАВЫ** (Лукашик Я.) .......... 80

**ИССЛЕДОВАНИЯ ПИРАМИД СРЕДНЕГО ЦАРСТВА** (Малашенко В.С.) .......... 83

**ЖЕНЩИНЫ В ПОЛИТИЧЕСКОЙ ЖИЗНИ НАЦИСТСКОЙ ГЕРМАНИИ** (Милицких Е.) .......... 88

**СВЕРХЧЕЛОВЕК И ПОДЧЕЛОВЕК: К ВОПРОСУ О СТАРОМ И НОВОМ ТИПЕ ТЕРРОРИСТА** (Тимонова А.) .......... 92

Навуковае выданне

# ВЫВУЧЭННЕ РОДНАГА КРАЮ ЯК СРОДАК ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ

*Матэрыялы студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі*
*г. Мінск, 5 красавіка 2005 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выдаецца ў аўтарскай рэдакцыі

*Адказны за выпуск* Л. М. Каранеўская

Падпісана ў друк 22.06.05. Фармат 60×84 1/16. Гарнітура *Арыял*.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 5,6. Ул.-выд. арк. 9,0. Тыраж 50 экз. Заказ 471.

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
*Установа адукацыі* «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».
ЛВ № 02330/0133496 ад 01.04.04.
ЛП № 02330/0131508 ад 30.04.04.
220050, Мінск, Савецкая, 18.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў Вучэбна-выдавецкім цэнтры БДПУ.
220007, Мінск, Магілёўская, 37.

сейчас ручей Карабель бежит у стен Гольшанского замка, и сейчас возвышается над окрестными холмами гольшанское городище – та самая "красивая гора", на которой основал князь Гольша свое поселение. С тех пор на протяжении трёх столетий княжили в Гольшанах князья Гольшанские. Гольшанские принимали участие Грюнвальдской битве с крестоносцами 1410 года. Род был богатым и влиятельным. Подписи Гольшанских одними из первых стоят на важнейших дипломатических актах того времени. Мужчины рода Гольшанских занимали важнейшие государственные посты, женщины побывали на великокняжеском и королевском престолах. С середины XVI века род Гольшанских угасает. Последняя княжна Гольшанская вышла замуж за Павла Сапегу и принесла родовое имение в приданое мужу, который возвёл великолепный замок, организовал "паперню" – фабрику по производству высококачественной бумаги со специальными водяными знаками – филигранями, изображающими герб Сапег "Лиса".

Павел Стефан Сапега, изгнавший из своих владений протестантов-кальвинистов, пригласил в Гольшаны католический орден францисканцев и построил для них монастырь и костёл, торжественно освящённый 6 августа 1618 года во имя Иоанна Крестителя. Простое и в то же время монументальное здание костёла с фигурным щитом фронтона характерно для раннего барокко. Отсутствие купола придает храму оттенок средневековой суровости и величественной мрачности. Немногочисленные образа посвящены традиционно почитаемым в Беларуси Ченстоховской Черной Мадонне, Остробрамской Божьей Матери. Реалистична выполненная в человеческий рост статуя святого Франциска Ассизского. Рядом с основателем ордена его святые последователи – франкисканцы: священник Максимилиан Кольбе, погибший в борьбе с фашизмом, Антоний Падуанский с ребёнком на руках (он считается покровителем детей). Кроме изображений святых, был в костёле и светский памятник – мраморное надгробие с фигурами Павла Стефана Сапеги и его трёх жён – Халевской, Весели и Гославской. Четвёртая, Данилович, пережила мужа и сама его похоронила. По традиции тех времен Сапега изображен в позе "спящего рыцаря", а его жёны в тяжелых, почти монашеских одеждах, что соответствует идеалу смиренной христианки. Надгробие Сапеги, уже повреждённое, в конце семидесятых годов было перевезено в Минск.

В середине XVIII века костёл перестраивался. Постройка представляет в плане прямоугольник, разделённый на три нефа. Средний, наибольший, неф костёла перекрыт цилиндрическим сводом, боковые, пониженные, нефы – крестовыми. Главный фасад без башен: его основным декоративным элементом является фигурный фронтон с волютами. Близкое архитектурное решение отмечается и на заднем фасаде, со стороны алтарной части. Стены декорированы пилястрами, нишами и прорезаны окнами с фигурными завершениями. Средний, наибольший, неф костёла перекрыт цилиндрическим сводом, боковые, пониженные, нефы – крестовыми [4].

Сейчас костел возращен верующим, в нём ведутся службы и продолжается реставрация. Часть монастырского здания принадлежит костёлу, в другой размещается филиал Национального художественного музея.

Чёрный замок Ольшанский. Владимир Короткевич описал его как хранителя легенд, как замок, полный неразгаданных тайн и неоткрытых сокровищниц. Увидеть его мечтает каждый человек, влюблённый в белорусскую историю.

ЛИТЕРАТУРА

1. Ткачев М.А. Замки Белоруссии. Мн., 1977.
2. Гарбусь Т.В. Страчаная спадчына. Мн., 2003.



3. Туризм и отдых №23 от 07.06.2001.
4. В.А. Чантурия. Памятники архитектуры и градостроительство Белоруссии. Мн.,1986.
5. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. М.- Л., 1950.

## АСАБЛІВАСЦІ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ МЯДЗЕЛЬШЧЫНЫ

***Кавяка І.***

Народная культура любога рэгіёна – кландайк для маладога навукоўца і, наогул, любога, хто цікавіцца гісторыяй свайго краю, хто неабыякавы да мінулага свайго народа. Гэты артыкул прысвечаны народнай культуры майго роднага краю – Мядзельшчыны. Даследаванне ахоплівае час ад пачатку XX ст. да яго сярэдзіны і заснавана на "жывых крыніцах" – успамінах, расказах тых людзей, для якіх ніжэйвыкладзеныя асаблівасці народнай культуры з'яўляліся звычайнымі паўсядзеннымі з'явамі.

Жыццё нашых продкаў укладвалася ў гадавы каляндарна-абрадавы цыкл. У гэтым коле умяшчаліся праца, святы з іх абрадамі і рытуаламі, падзеі асабістага сямейнага жыцця. Да ўсяго гэтага выразна дастасоўвалася харчаванне. Перыядычнасць прыёмаў ежы залежала ад пары году і даўжыні светлавога дня. Улетку харчаванне па тры разы на дзень, як гэта было зімой, замянялася чатырохразовым, сняданне адбывалася рана, вячэра позна, уводзіўся падвячорак. Былі тыповыя наборы страў для снядання, абеду, падвячоркаў і вячэры . Асобныя стравы існавалі таксама і для пастоў і мясаедаў, святочных дзён, сакральных застолляў. Заўсёды пры частаванні клалі шмат хлеба, нарэзанага вялікімі тоўстымі скібамі. Тоненькія скібачкі лічыліся прыкметай скупасці ці дзівацтва [1].

Разнастайнасць і багацце стала ў многім залежалі ад заможнасці гаспадаркі, сямейных традыцый і індывідуальнага ўмельства гаспадыні. Умела звараная ежа нават без каштоўных кампанентаў была смачнай і спажыўнай. Шмат відаў ежы ўжо адышлі ў нябыт. Рэдкасцю у весцы з'яўляецца сення поліўка з "пасокі" (свежай крыві), якую гатавалі адразу ж, калі калолі свіней. Архаізмам харчавання сталі аўсяны кісель, мілта, масляк з маку ці з канапель, макавая або канапляная смятанка, камы з гароху ці бобу, пражаны гарох, параная рэпа, ільняны або канапляны алей і інш. [ 2,498 ].

Паводзіны за сталом сведчаць аб іх глыбокай старажытнасці. Да нядаўняга часу сям'я ела з адной вялікай міскі, хоць лыжку кожны мог мець сваю ўласную. Есці з адной міскі азначала быць раўнапраўным членам сям'і, неабдзеленым, непакрыўджаным. Першым да ежы прыступаў бацька або дзед, той хто лічыўся галавой сям' і. Пасля за лыжкі браліся і ўсе астатнія, перад тым, як пачаць есці, усе абавязкова хрысціліся і казалі невялікую малітву. Перахрысціцца і падзякаваць богу і гаспадыні трэба было і пасля прыему ежы, перад тым, як выходзіць з-за стала [1].

Што тычыцца гігіены, то часта браліся пад увагу не ўласна гігіенічныя, а хутчэй эстэтычныя, этычныя аспекты. Пры бруднай рабоце чалавек у бруднай вопратцы адчуваў сябе нармальна, а пры чыстай (напрыклад, на сенакосе) трэба было адпаведна быць апранутым – чыста, акуратна, звычайна ў светлай ільняной кашулі [3]. Ахайнасць вопраткі, чысціня цела, зграбнасць прычоскі патрабаваліся найперш ад дзяўчат. У адваротным выпадку не пазбегнуць абгавораў, высмейвання.

Добрым звычаем на Мядзельшчыне было рэгулярнае мыццё ў лазні. Там жа мылі брудную бялізну, якую гаспадыні потым залівалі гарачым "лугам" (растворам попелу, які ўтвараўся пры прапусканні кіпеню праз попел і вуглі), паласкалі, сушылі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на сонцы, ветры, марозе. Гэтым жа "лугам" мылі і валасы, так як пра шампунь у той час у весцы яшчэ нават і не чулі. Мінеральныя рэчывы, якія ўтрымлівае попел, рабілі валасы мяккімі, блішчастымі, іх легка было расчасаць [1]. У крамах звычайна гузікаў да бялізны не куплялі, а рабілі іх самі з тоўстых суконных нітак. Пад цяжкім валком самаробныя гузікі толькі плюшчыліся, а не ламаліся, як гэта бывала з фабрычнымі.

Значны клопат прычынялі людзям паразіты, ад якіх вельмі цяжка было пазбавіцца, паколькі ўсе жылі ў цесным кантакце. З клапамі змагаліся ў асноўным варам, апякаючы месцы іх скаплення ў сценах каля ложкаў і ў саміх ложках. Рабілася гэта ў час генеральнай уборкі перад гадавымі святамі або ў любы час. Прусакоў вымарожвалі, пакінуўшы хату ў люты мароз няпаленай і перабраўшыся да суседзяў [2,499].

Ад эпідэмій і хвароб стараліся засцерагчыся старадаўнімі магічнымі спосабамі. Адным з іх было тканне "абыдзеннага" палатна, наметкі, які павінен быў засцерагчы людзей ад розных нягод. Шмат работы, што папярэднічалі канечнаму прадукту, каштоўнасць самой тканіны, на якую траціласяшмат часу, умельства і сіл, прымушала рацыянальна выкарыстоўваць палатно. Нават выраб простага двухнітовага палатна патрабаваў шматлікіх ткацкіх навыкаў і ўмельстваў.Трэба было разлічыць яго аснову, даўжыню і шырыню, завесці кросны, не дапусціць недасекаў і іншага тэхнічнага браку. Пры шматнітовым узорыстым ткацтве майстрыха спалучала тэхнічнае ўмельства з мастацкім густам, адчуваннем малюнка, колеру. Большасць народных узораў – варыяцыі на тэмы, знаёмыя з даўніх часоў. Каларыстычная гамма дываноў і посцілак заўсёды стрыманая. На іх адбілася ўся беларуская геаметрыя. Пазней з'явіліся перабіранкі, перабіраныя ручнікі і дываны, якія вельмі цаніліся за складанасць работы, працаёмістасць [2,499].

Клопаты пра матэрыяльны дабрабыт, бясконцая праца ў полі і дома забіралі ў чалавека шмат сіл і здароўя. Аднак працоўны каляндар селяніна ўключаў таксама і шмат свят, кірмашоў, фэстаў, якія разбівалі штодзённую манатоннасць, рабілі жыццё цікавым. Сама ж праца аплялася абрадамі, рытуаламі, утвараючы як бы яскравае відовішча, дзе чалавек сутыкаўся з нейкімі вышэйшымі сіламі. Абрадавы вусна-паэтычны комплекс Мядзельшчыны адносіцца да цэнтральнабеларускага, паколькі ў ім выразна праяўляюцца тыя асаблівасці, якія складаюць спецыфіку нацыянальнай вуснай паэзіі [2,500]. Так, на Мядзельшчыне былі пашыраны і доўга жылі валачобныя абходы двароў і валачобныя песні, тут спяваліся і восеньскія песні. Вышэйпералічаныя адсутнічаюць у творчасці іншых славянскіх народаў.

Як і па ўсёй Беларусі, на Мядзельшчыне фальклор быў моцна ўбудаваны ў каляндарна–абрадавы цыкл года. Амаль кожны пераход да новага адрэзка круга ўшаноўваўся наборам пэўных абрадаў, песень, варожбаў і найперш памінаннем продкаў-дзядоў. Дзяды ўшаноўваліся запрашэннем мыцца ў лазні, дзе сям'я пасля свайго мыцця пакідала вядро цёплай вады і венік, а таксама на рытуальную вячэру, для якой гатавалі вялікую колькасць страў. Перад Дзядамі ачышчалі падворак, хату: продкі павінны былі быць задаволены ладам у родзе, сям' і [4]. Сёння свята Дзядоў шмат дзе вядома і пад іншай назвай – свята Усіх Святых, якое спраўляецца 1 лістапада і дзень Задушных, які адзначаюць на наступны дзень. Пасля імшы ў касцёле, людзі ідуць на магільнік, прыводзяць у парадак магілкі сваіх продкаў, на кожнай з іх ставяць свечку, моляцца. Пасля вяртаюцца дадому, дзе чакае рытуальная вячэра. Паводле старадаўняга звычаю, перш чым пакаштаваць якую-небудзь страву, крыху яе адкладалі ў спецыяльны посуд – для продкаў, якія ноччу абавязкова наведаюць хату і пачастуюцца [5].



Даўней да зямлі, да поля, што дае чалавеку надзённы хлеб, ставіліся як да жывога, таемнага, непасцігальнага. У пачатку ці ў працэсе выканання любой работы вымаўляліся замова, засцярога, зварот да вышэйшых сіл, каб яны садзейнічалі, памагалі. Так, падышоўшы да нівы, жняя найперш канцом сярпа стукала ў каменьчык, нібы прабуджаючы зямлю, ніву, ды і сама канцэнтравалася, арганізоўвалася. У той дзень, калі разлічвалі зжаць жата, на ніву выходзіла галоўная гаспадыня, прыносілі больш багаты абед. Калі заставаўся ўжо невялікі ўчастак прыблізна на сноп, гаспадыня пачынала "Спарыню гукаць" і паступова маленькімі жменькамі па сонцу зжынала яго ў апошні сноп. Калі яна заканчвала жаць, усе жнеі садзіліся на апошні сноп, даставалі полудзень, частаваліся і спявалі. Так заканчвалася вялікая і важная праца, якая завяршала цэлы шэраг захадаў, скіраваных на забеспячэнне сям' і надзённым хлебам.

Абжынкі спраўлялі больш багатыя людзі, што наймалі жней. Для іх ладзілі заключны пачастунак, у час якога жнеі спявалі, узвялічваючы гаспадара [2, 501].

Ад празмернага працоўнага напружання ратавалі святы і прысвяткі, калі працаваць строга забаранялася. Асабліва строгая забарона працаваць існавала на Звеставанне. На гэта свята "птушка гнязда не ўе, дзеўка касы не пляце" [6, 54]. Каб пазбегнуць парушэння забароны, выпадкам не зачапіцца за якую-небудзь работу, неабходна было ўсе прылады працы знесці з вачэй. На Звеставанне бацяны прылятаюць з выраю, а гадзюкі вылазяць з нораў. Лічылася, што найбольш у бягучым годзе пашанцуе таму, хто першы ўбачыць бацяна [3].

Жыхары Мядзельшчыны арганічна спалучалі патрабаванні хрысціянства і перажыванні язычніцкай пары. Апошнія ў разглядаемы перыяд былі мацнейшымі. Форма ж іх часта хрысціянізавалася. Узорам сапраўднага ідалапаклонства з'яўляліся міфы пра Хута. Хут – міфічны персанаж мясцовага паходжання. Паводле міфа, Хут – нейкая таямнічая істота, што пасяляецца ў гаспадара і спрыяе яму ў гаспадарцы, носіць золата са схаваных скарбаў, снапы з чужых палёў. Яго можна нават бачыць, як ляціць па небе, чорны, калі нясе снапы, вогненна-чырвоны, калі нясе золата. Яго трэба смачна карміць, найлепш яечняй, якую гаспадыня ставіла на гарышчы і клікала Хута. Тады ён пад'есць і добра спрыяе ў гаспадарцы. Жывёлу гаспадарскую як упадабае, то тая сыцее і расце, а як незалюбіць, то ссушыць [2, 502].

Хут крыўдлівы і гняўлівы. За крыўду можа спаліць сялібу. Сам можа перакінуцца ў палена, старое кола, корч і застацца на пажарышчы, пакуль хто выпадкова не падбярэ яго. Тады пачынае служыць новаму гаспадару, і той хутка багацее. Але часам Хут заставаўся ў сялібе тых гаспадароў, што некалі жылі тут, а дом іх быў "нячысты", бо дочкі мелі пазашлюбных дзяцей, губілі іх і там хавалі. Так што, як бачым, Хут мае нейкія адносіны да нехрышчоных нябожчыкаў [7].

Пашыранымі на Мядзельшчыне былі апавяданні пра здані. Існавалі такія месцы, дзе многім людзям нешта здавалася. Там будавалі капліцы, ставілі крыжы. Меркавалі, што на такіх месцах пасля заходу сонца з'яўляліся прывіды. У здані верылі, іх баяліся, ад іх ратаваліся малітвай. Апавяданні пра сустрэчы са зданямі нагадваюць сучасныя справаздачы пра сустрэчы з НЛА. Аднак розніца ў тым, што карані зданяў – у традыцыйных мясцовых паданнях. Яны звязваюцца з пэўнымі мясцінамі нашай зямлі, якая здавалася людзям дастаткова вялікай, таямнічай, поўнай загадак і дзіваў. Расказвалі пра адно месца ля в. Сваткі, дзе ладны круг зямлі не зарастаў травой. Тут некалі было такое здарэнне: моладзь ішла на Усяночную, але па дарозе не ўтрымалася, утварыла карагод і пусцілася ў скокі. За грэх усе праваліліся скрозь зямлю [2, 503].

З'яўленне зданяў звязвалася з могілкамі, старымі паселішчамі, гарадзішчамі, месцамі таемнага пахавання нехрышчоных немаўлят, у асноўным са

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

светам мёртвых, з душамі нябожчыкаў. Гэты язычніцкі пласт народных уяўленняў і вераванняў злёгку хрысціянізаваны.

Шмат архаічных элементаў захоўваецца таксама ў тутэйшых казках-"баснях", абрадавых песнях і саміх абрадах, ва ўсіх творах традыцыйнай народнай культуры.

ЛІТАРАТУРА


1. Расказы жыхаркі в. Засвір Кісель Дануты Браніславаўны.
2. Памяць. Гісторыка-дакументая хроніка Мядзельскага раена. Мн., 1998.
3. Успаміны жыхаркі в. Ключаткі Буйчык Веранікі Альбертаўны.
4. Успаміны жыхаркі г. п. Свір Кавяка Рэгіны Іосіфаўны.
5. Расказы жыхаркі в. Сурвілы Свіршчэўскай Яніны Ізыдораўны.
6. Касцюкевіч Л. П. Беларускія народныя абрады. Мн., 1994.
7. Расказы жыхара в. Наваселкі Малько Івана Часлававіча.


## ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ МІКОЛЫ ЕРМАЛОВІЧА

***Кісель Г.***

Мікола Ермаловіч нарадзіўся 29 красавіка 1921 г. у в. Малыя Навасёлкі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1938 г. скончыў Дзяржынскую школу і паступіў на беларускае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М.Горкага. Да пачатку вайны скончыў 3 курсы. З-за дрэннага зроку на фронт не трапіў [1,669]. І. Далідовіч, рэдактар часопісу "Маладосць", успамінаў, што няшчасці праследавалі М.Ярмаловіча з дзяцінства: "Калі яму яшчэ было толькі паўгода, маці узяла яго на поле, дзе жала жыта. Там снапы склала, каб ад сонца яго берагчы, і калі снапы тыя ўпалі, Мікалай Іванавіч амаль аслеп... У гады вайны ён паехаў у бежанцы. У Маскве, вяртаючыся, трапіў паміж буферамі цягніка так, што з вачэй пырснула кроў. Ён паехаў арганізоўваць школу ў Віцебскую вобласць і там трапіў на міннае поле..." [2].

У 1941-43 гг. Мікола Ярмаловіч працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Мардоўскай АССР. У кастрычніку 1943 г. вярнуўся ў вызваленыя раёны Беларусі, дзе пачаў працаваць у аднаўленых школах. У 1947 г. закончыў вучобу ў пединстытуце, пасля чаго быў накіраваны ў Маладзечанскі настаўніцкі інстытут, дзе выкладаў да 1955 г.: "Прапанавалі пісаць кандыдацкую дысертацыю "Вобраз Сталіна ў беларускай літаратуры і фальклоры". Гэта быў здзек на мяне, бо ў 1937 г. арыштавалі майго бацьку, які рабіў у калгасе конюхам, а мяне выключылі са школы, як сына ворага народа". Кінуў я гэтую аспірантуру і пераехаў у Маладзечна, стаў выкладаць літаратуру ў Маладзечанскім настаўніцкім інстытуце. Калі пасля працаваў у абласным істытуце ўдасканальвання настаўнікаў, дык пільна сачыў, каб усё, што выходзіць з метадычнага кабінета, якім я кіраваў, у школы было напісана па-беларуску. Клопат пра нацыянальныя справы ніколі не кідаў, я захоўваў родную мову ў побыце і на рабоце" [3].

У 1957 г. М. Ермаловіч выйшаў на пенсію ў сувязі са значнай стратай зроку. Першыя вершы надрукаваў у раённай газеце "Ударнік Дзяржыншчыны" у 1937 г. З таго часу сістэматычна змяшчаў свае творы на старонках розных перыядычных выданняў. Першую кніжку, прысвечаную сувязям Леніна з Беларуссю ("Дарагое беларусам імя"), выдаў у 1970 г. Шмат артыкулаў прысвяціў Ф. Багушэвічу, Я. Лучыне, Я.Купалу, Я.Коласу і іншым выдатным беларускім пісьменнікам. Асабліва плённа працаваў над гістарычнай тэматыкай. М. Ермаловіч – лаўрэат Дзяржаўнай



прэміі Беларусі імя К. Каліноўскага, ганаровы грамадзянін г. Маладзечна. Узнагароджаны медалём Ф.Скарыны [1,670].

Мікола Ермаловіч аб сваім лёсе: "Я вельмі ўдзячны свайму лёсу за тое, што ён назаўсёды звязаў мяне з роднай мовай, прывіў любоў да яе і адданасць ёй. Зерні гэтага ў мае свядомасць і душу былі закінуты яшчэ ў пачатковай школе, калі поўным ходам ішла беларусізацыя, і таму ўсё было прасякнута духам беларускага адраджэння. Не менш мне пашанціла ў гэтым накірунку ў час вучобы ў Койданаўскай сярэдняй школе, дзе беларускую мову і літаратуру выкладала настаўніца Паўла Стралкоўская. У ліку іншага, яна заахвочвала творчыя пачаткі ў сваіх вучняў, чаму асабліва садзейнічаў арганізаваны і кіруемы ёй літаратурны гурток. Менавіта творчасцю яго удзельнікаў і запаўняўся літаратурны часопіс "Наша творчасць", якім асабліва ганарылася школа. У ім былі змешчаны мае першыя вершаваныя спробы. Усё гэта і вызначыла канчаткова маю жыццёвую мэту. У 1966 г. начальнік Маладзечанскага КДБ Іваноў на адной з нарад назваў мяне "жывым іскапаемым". А ў 1984 г. я тройчы выклікаўся на допыт у КДБ. Я перайшоў да самвыдавецкай справы. У 60-я гады выдаваў рукапісны квартальнік "Падснежнік", а ў 70-я гады - машынапісны тыднёвік "Гутарка". У іх, апроч іншых актуальных праблем, важнае месца займалі аднаўленне гістарычнай памяці нашага народу ("Рагвалод і Рагнеда", "Няміга і Мінск", "Прычына нашых крыўд і бед"), а таксама паказвалася першапачатковае значэнне мовы і жахлівыя вынікі яе вынішчэння ("Мова - сцяг народа"). Для мяне было заўсёды галоўным змагацца за жыццё сваёй Радзімы, за яе гонар, а гэта без барацьбы за яе мову, за аднаўленне яе гістарычнай памяці немагчыма" [4].

З 1957 г. М. Ермаловіч прысвячае сябе навукова-даследчай працы. Галоўныя тэмы дзейнасці: гісторыя Беларусі ў IX-XIV стст. і беларуская літаратура.

У 1963 г. М. Ермаловіч пачынае выдаваць рукапісны (самвыдат) часопіс "Падснежнік".

Вынікам тытанічнай доследнай працы становіцца напісанне ў 1968 г. кнігі "Па слядах аднаго міфа", якая на працягу доўгага часу хадзіла па руках самвыдатам і упершыню афіцыйна выйшла ў 1989 г. Фрагменты першага варыянта гэтай кнігі былі ў свой час апублікаваны ў адным з акадэмічных выданняў па археалогіі і адразу ж сустрэлі адпор з боку кансерватыўных беларускіх гісторыкаў, якія прапанавалі звярнуцца ў ЦК КПБ з афіцыйным лістом, каб забараніць аўтару друкаваць свае навуковыя творы. У 1988-1989 гг. часопіс "Маладосць" друкуе яго вялікую працу "Старажытную Беларусь". Яе выданне сведчыць аб тым, што М. Ермаловіч з'яўляецца заснавальнікам новай беларускай рамантычнай гістарыяграфіі, якая адкінула савецкую канцэпцыю несамастойнасці гісторыі Беларусі. Па прычыне палітычных матываў галоўныя канцэптуальныя працы Ермаловіча не маглі з'явіцца ў афіцыйным друку .Таму яго рукапісы ў 1970-80-х гг. выдаваліся і распаўсюджваліся ў неафіцыйным друку. Напрыклад, самвыдатам памнажалася праца "Па слядах аднаго міфа: ці было літоўскае заваяванне Беларусі?" Іншы раз такім жа чынам распаўсюджваліся навуковыя працы, якія ўжо былі апублікаваны ў афіцыйным друку. Напрыклад, рабіліся шматлікія фотакопіі з артыкула "Балцкія плямёны Беларусі", "З гісторыі" (газета "Голас Радзімы", 5 лістапада 1981).

З пачаткам перабудовы ў былым СССР свет убачылі некалькі прац М. Ермаловіча, у тым ліку "Па слядах аднаго міфа" (1989 – 1-е выданне, 1991 – 2-е выданне, 2001 – 3-е выданне), " Старажытная Беларусь: Полацкі і Навагародскі перыяды" (Мн.,1990), "Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд" (Мн., 1994).

У гісторыі старажытнай Беларусі ў IX-XIV стст. М. Ермаловіч вылучаў 3 перыяды: полацкі (IX-сяр. XIII ст.), навагародскі (сяр.XIII – пач. XIV ст.), віленскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ